ладаць на ўсіх спецыялізацыях або распрацаваць і дадаць да праграмы практыкі "Метадычныя матэрыялы па павышэнні кампетэнтнасці ў зносінах", дзе змясціць агульныя парады, рэкамендацыі і мінімум тэарэтычных ведаў, неабходных і дастатковых для паспяховых зносін з чытачамі і бібліятэкарамі.

І.Н.Колабава,
ст. выкладчык Беларускага універсітэта культуры

## АРХЕАЛАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА: ПРАБЛЕМЫ І СПОСАБЫ ІХ ВЫРАШЭННЯ

У адпаведнасці з вучэбным планам па курсе "Археалогія" на працягу трох апошніх гадоў на кафедры гісторыі і музеязнаўства са студэнтамі II курса спецыяльнасці "музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры" праводзіцца 2-тыднёвая вучэбная студэнцкая палявая археалагічная практыка. Яна ўваходзіць у агульны практычны курс, які ўключае азнаямляльную і камеральную часткі археалагічнай практыкі.

Базай практыкі з'яўляецца Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Кіруе практыкай ад Інстытута гісторыі старшы навуковы супрацоўнік кандыдат гістарычных навук Ю.А. Заяц.

Археалагічная практыка праводзіцца на Менскім гарадзішчы ля в. Гарадзішча Шчомысліцкага с/с Мінскага раёна.

Менскае гарадзішча з'яўляецца комплексам археалагічных помнікаў, найбольш ранніх з якіх адносяцца да культуры штрыхаванай керамікі. Менавіта тут першапачаткова знаходзіўся старажытны Менск, і студэнты-практыканты, такім чынам, упершыню непасрэдна дакранаюцца да старажытнай гісторыі Беларусі.

Удзел у земляных работах на помніку археалогіі дазваляе кожнаму студэнту выканаць галоўную задачу практыкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— атрымаць уяўленне аб методыцы правядзення археалагічных раскопак і пазнаёміцца з першаснай апрацоўкай выкапняў.

Акрамя таго, будучым музейным супрацоўнікам неабходна на практыцы даведацца, адкуль "прыходзяць" у музей экспанаты археалагічных збораў. Праца ў музеях гістарычнага профілю прадугледжвае не толькі веданне асноўных правіл апрацоўкі археалагічнага матэрыялу, але і добры ўзровень агульнай гістарычнай падрыхтоўкі. Усяму гэтаму вельмі спрыяе ўдзел студэнтаў у археалагічнай практыцы.

Атрыманыя практычныя веды дазволілі некаторым студэнтам-музеязнаўцам на працягу летніх канікул прыняць удзел у археалагічных даследаваннях, што праводзіліся Нацыянальнай акадэміяй навук на тэрыторыі рэспублікі.

Не трэба выключаць і аздараўляльны аспект гэтай практыкі для студэнтаў.

У перыяд практыкі студэнты вядуць рабочыя дзённікі, у якіх падзённа распавядаюць пра ход працы, знойдзеныя рэчы, апісваюць працэс іх апрацоўкі.

Акрамя таго, практыканты знаёмяцца з агульнай методыкай правядзення археалагічных даследаванняў.

Па заканчэнні практыкі праводзіцца залік, на якім студэнты павінны паказаць атрыманыя веды.

Акрамя таго, на месца раскопу на азнаямляльную археалагічную практыку прыязджаюць студэнты-музеязнаўцы I курса, а таксама праводзяцца практычныя заняткі па спецкурсе "Палявая археалогія" на старэйшых курсах.

Агульная плошча раскопу за ўвесь перыяд склала больш за 200 кв.м.

Рэчавыя знаходкі паступаюць у Інстытут гісторыі НАН РБ і вучэбны музей Беларускага універсітэта культуры. Сярод іх металічныя вырабы, разнастайная кераміка, шкло, манеты ад IX да XIX ст.

Практыка не патрабуе укладання значных матэрыяльных сродкаў. Універсітэт і Інстытут гісторыі забяспечваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыкантаў працоўным інвентаром і вымяральнай апаратурай.

Асноўныя праблемы, якія ўзнікаюць на працягу археалагічнай практыкі, звязаны з яе агульным матэрыяльным забеспячэннем (транспартнымі паслугамі, аплатай працы навуковага кіраўніка і г.д.). Вырашэнне гэтых праблем магчыма толькі пры наяўнасці ва універсітэце добрай матэрыяльнай базы для правядзення вытворчай практыкі.

**А.А.Корбут,**
**ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## СУПЕРВІЗАРСТВА[1] ЯК ЧАСТКА ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ САЦЫЯЛЬНАГА РАБОТНІКА

Супервізарства з'яўляецца адным з атрыбутаў прафесіяналізму ў замежнай сацыяльнай рабоце. Гэта ўзровень тэхналогіі арганізацыі сацыяльнай работы, які ўключае падрыхтоўку сацыяльнага работніка, яго далейшы прафесійны рост, прафілактыку прафесійнай рызыкі.

Як вядома, сацыяльная работа прызнана адным са спецыфічных відаў прафесійнай дзейнасці з павышаным узроўнем псіхалагічнай нагрузкі. Сацыяльны работнік схільны да прафесійнай рызыкі, што прыводзіць яго да стрэсавых сітуацый. Сярод шматлікіх стрэсагенных фактараў у прафесійнай сацыяльнай рабоце можна назваць такія, як пастаянная павышаная эмацыянальная нагрузка, неабходнасць дзейнічаць у непрадказальнай сітуацыі, няўпэўненасць у канчатковым станоўчым выніку сваіх дзеянняў, павышаная адказнасць не толькі за свае, але і за дзеянні іншых і, нарэш-

[1] У перакладзе гэта слова азначае "нагляд". Аднак беларускае слова "нагляд" у сучасным сэнсавым варыянце не адпавядае зместу англійскага слова "supervision". Іншы раз гэта слова перакладаюць як "кантроль і назіранне ў сацыяльнай рабоце". Але кантроль і назіранне — гэта толькі частка прафесійнага супервізарства. Найбольш блізкім па змесце ў беларускай мове тэрміну "супервізар" з'яўляецца слова "настаўнік".



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ